# Даступнасць і дыскрымінацыя беларускай мовы ў Беларусі

## Вынікі анкетавання, статыстыка і прыватныя гісторыі

Аліна Нагорная

Беларуская мова стагоддзямі сутыкалася з дыскрымінацыяй і перашкодамі ў тым, што тычыцца яе публічнага ўжытку: адукацыі, кнігадруку, дзяржаўнага кіравання, культуры. Нягледзячы на гэта, да канцу Другой Сусветнай вайны, нават калі Беларусь знаходзілася ў складзе Расійскай імперыі, беларуская мова была галоўнай мовай штодзённай камунікацыі для абсалютнай большасці беларусаў.

У пяцідзясятыя гады XX ст. савецкая ўлада ўзяла курс на поўную і канчатковую русіфікацыю ўсяго беларускага грамадства, і гэты працэс ідзе з таго моманту практычна бесперапынна. Выключэннем быў нядоўгі перыяд запаволення, але не спынення, русіфікацыі ў першай палове дзевяностых, пасля таго, як у 1990 г. беларуская мова стала адзінай дзяржаўнай мовай у БССР (з 1991 – у Рэспубліцы Беларусь). Але ўжо ў сярэдзіне дзевяностых гадоў беларуская мова гэтага статусу была пазбаўленая і русіфікацыя зноў стала асновай дзяржаўнай моўнай палітыкі Беларусі, хоць яна на той момант ужо была незалежнай краінай.

Рэферэндум 1995 г., з спасылкай на вынікі якога руская мова атрымала нібыта “аднолькавы” статус з беларускай, быў праведзены са значнымі працэдурнымі парушэннямі. Людзі, якія выступалі супраць гэтага рэферэндуму, у тым ліку дэпутаты Вярхоўнага Савету Беларусі, сталі аб’ектам рэпрэсій.

Паводле цяперашняй Канстытуцыі, дзяржаўнымі мовамі ў Беларусі з’яўляюцца беларуская і руская. Але, нягледзячы на іх фармальна аднолькавы статус, руская мова дамінуе ва ўсіх сферах, а людзі, якія карыстаюцца беларускай мовай, штодзённа сутыкаюцца з дыскрымінацыяй. Па-беларуску немагчыма атрымаць адукацыю, аформіць картку ў банку, запісацца да лекара, скласці дамову, набыць прадукты, прачытаць важную тэхнічную інфармацыю. Калі ў звычайнай побытавай сітуацыі чалавек звяртаецца на беларускай мове да прадаўца ў краме, менеджара ў банку, служачага ў дзяржаўнай арганізацыі ці проста да мінака, у большасці выпадкаў суразмоўца перадусім адрэагуе не на змест сказанага, а на факт ужывання беларускай мовы. Рэакцыя можа быць як пазітыўная, так і негатыўная.

Беларуская мова ўключана ЮНЕСКА ў спіс моў, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення (статус: vulnerable, “уразлівы”).

*Мы апыталі 482 чалавека ва ўзросце ад 15 да 72 год, якія карыстаюцца беларускай мовай у Беларусі. У фокусе апытання была даступнасць адукацыі, інфармацыі і абслугоўвання на беларускай мове.*

*У гэтай рабоце прадстаўленыя вынікі анкетавання, а таксама юрыдычная інфармацыя, статыстыка і прыватныя гісторыі людзей, што размаўляюць па-беларуску ў Беларусі.*

Я сутыкаюся з асаблівым стаўленнем праз тое, што размаўляю па-беларуску (маюцца на ўвазе як добрыя, так і кепскія моманты, пры тым, што пры размове па-руску стаўленне было б звычайным)




**Вольга**: Актыўна размаўляць па-беларуску я пачала з лета гэтага года. Калі сказала, што ўсё, я буду размаўляць на беларускай, то сям'я адрэагавала: "разговаривай на нормальном языке", "разговаривай нормально" ("размаўляй на нармальнай мове", "размаўляй нармальна")

**Сяргей**: Ой, нават, калі хто-небудзь кампліментарна каментуе тваю мову, адчуваеш сябе, нібы афрыканец, чарнатой скуры якога захапляюцца: "Ох, такая чорная!"

**Аксіння**: На мяне аднакласнікі глядзелі як на дурніцу, калі я пачала выкарыстоўваць беларускую мову.

**Алена**: Зайшла ў інфакіёск, а там ёсць выбар мовы – ёсць руская, англійская, кітайская, але няма беларускай. Ну я напісала скаргу, каб яны гэтае пытанне вырашылі. І цяпер у мяне ёсць афіцыйны адказ, што "дадаць беларускую мову тэхнічна немагчыма".

**Гэнік**: На трэці дзень [арышту] суд дайшоў і да нашай камеры. Судзілі анлайн, суддзя ад балды дае камусьці 13 сутак, камусьці – 15. Мне далі 20. Я ведаю, за што: за беларускую мову.

Я сутыкаюся з перашкодамі пры карыстанні беларускай мовай.



# Адукацыя і беларуская мова

Фармальна, грамадзянам Беларусі забяспечана права атрымліваць адукацыю на беларускай мове. Вось, як гэта прапісана ў Канстытуцыі: “Дзяржава гарантуе ў адпаведнасці з законам свабоду выбару мовы выхавання і навучання”.

Згодна з арт. 82 Кодэкса аб адукацыі, асноўнымі мовамі навучання і выхавання ў Беларусі з’яўляюцца дзяржаўныя мовы краіны. Дзяржава гарантуе грамадзянам права выбару навучання і выхавання на адной з дзяржаўных моў Беларусі.

Але ёсць агаворка: мова навучання і выхавання вызначаецца заснавальнікамі ўстановы з улікам пажаданняў бацькоў. Міністэрства адукацыі сыходзіць з таго, што беларускамоўныя школы і класы адкрываюцца па заявах бацькоў, але рашэнне пра адкрыццё ці закрыццё школ і класаў прымаюцца мясцовымі выканкамамі. У выніку заява ад бацькоў не гарантуе, што дзіця зможа навучацца на беларускай мове.

Калі б зараз вы або вашыя дзеці атрымлівалі адукацыю ў Беларусі, якую мову вы б абралі?



# Дзіцячыя садкі

**Валерыя**: Найбольш рэзка адчуваеш моўную дыскрымінацыю, калі пачынаеш выхоўваць дзіця. Па-першае, гэта вельмі дарага – кнігі, метадычны матэрыял. Вы не можаце проста пайсці ў краму і набыць, напрыклад, карткі са словамі ці нешта такое, як гэта робяць рускамоўныя маці. Па-другое, беларускамоўныя дзіцячыя садкі – гэта хутчэй прафанацыя і падман. Напрыклад, садок пазіцыянуецца беларускамоўным, але фактычна там толькі раз на тыдзень нешта па-беларуску адбываецца.

**Аляксандр**: У дзіцячым садку трэба было анкету нейкую запоўніць. І там не так даўно з'явіўся пункт з магчымасцю абіраць мову, на якой будуць камунікаваць з дзіцём. Ну мы, зразумела, такія: "О, файна, можна па-беларуску!" І толькі я хацеў ставіць плюсік у клетачку, дык супрацоўніца, якая прымае дакументы, аж кінулася да мяне, адсунула маю асадку і сказала: "Ой, калі ласка, толькі не па-беларуску". Я кажу: "Што за праблема? У анкеце ёсць пункт "па-беларуску" і я хачу, каб па-беларуску выхоўвалася маё дзіця, калі ёсць такая магчымасць".

Хвілін дзесяць мы спрачаліся, але ўсё ж супрацоўніца перaканала мяне паставіць значок у пункце "выхоўваць па-руску".

Самае цікавае, што мы шукалі беларускамоўны садок недалёка ад нас, і ён ёсць у пары кіламетраў. Але там вялікая чарга, і калі б мы захацелі ў яго пайсці, то не змаглі б патрапіць.

На якой мове вы выхоўваліся ў дзіцячым садку?




Ці была ў вашых бацькоў магчымасць абраць беларускую мову выхавання для вас у вашым дзіцячым садку?



**Аляксандра**: У Першамайскім раёне Мінска бацькі хацелі, каб у дзіцячым садку стварылі групку з беларускай мовай навучання. У нас у адміністрацыях раёнаў кажуць, што попыту няма, таму і групак такіх няма. А тут вось ёсць, адчыняйце. І яны пачынаюць выкручвацца і так, і гэтак. Кажуць, што немагчыма адчыніць. Бацькі не здаваліся, хадзілі тыдзень за тыднем і трэслі іх там, каб яны стварылі тую групу. І нічога – ім усё адмаўлялі і адмаўлялі.

У выніку бацькі падалі позву ў суд. Але суд проста не прыняў іх заяву да разгляду, бо, маўляў, няма нагоды яе разглядаць. Потым бацькі склалі скаргу ўжо на суд за тое, што не прыняў заяву. І толькі тады ўжо чыноўнікі неяк заварушыліся. Адкрылі ім тую групу, але ў месцы, дзе ўсім нязручна. Першамайскі раён вельмі вялікі, і бацькам вазіць дзяцей туды далёка.

Доля людзей, што выхоўваюцца ў **дашкольных дзіцячых установах** па-беларуску ў працэнтах ад агульнай колькасці на пачатак навучальнага году.



# Школы

Як паказвае статыстыка, у перыяд з 1996 па 2021 гг. колькасць вучняў, якія навучаюцца па-беларуску, штогод у сярэднім зніжалася на 1%. За кошт зніжэння колькасці беларускамоўных вучняў колькасць вучняў, якія навучаюцца па-руску, штогод расла.

Нізкі працэнт школьнікаў, якія навучаюцца на беларускай мове, вядзе да змяншэння колькасці асобаў, якія валодаюць натуральным маўленнем і карыстаюцца беларускай мовай у побыце. Гэта наўпростава ўзмацняе пагрозу знікнення беларускай мовы з актыўнага ўжытку.

**Алеся**: Аднойчы настаўніца па матэматыцы на кантрольнай рабоце пабачыла, што ў маім сшытку я напісала “кантрольная работа” па-беларуску, і пачала на мяне крычаць за гэта. Сказала: “Мы знаходзімся ў рускамоўнай школе”. Я ёй адказала, што мы ў Беларусі і я магу размаўляць па-беларуску, і тут нічога такога няма. Яна пачала казаць: “А што, калі якая-небудзь праверка прыйдзе і ўбачыць, што тут напісана па-беларуску?” У выніку яна мне сказала, каб я там усё закрэсліла і напісала па-руску.

**Валерыя**: Калі я пачала шукаць, то высветлілася, што ў Заводскім раёне [Мінска] з вялікай колькасці класаў, якія фармальна заяўленыя беларускамоўнымі, сапраўды беларускамоўнымі былі толькі два.

На якой мове ў школе вам выкладалі большасць прадметаў?




На якой мове была большасць вашых падручнікаў у школе?



**Сяржук**: Першая мова, якую я вывучыў, была беларуская. Да шасці гадоў я гадаваўся ў бабулі з дзядулем у вёсцы, беларуская мова была ў мяне з дзяцінства роўнай з рускай. Калі я пайшоў у школу, не было праблемы, чытаць па-беларуску ці па-руску.

У школе палова падручнікаў былі на беларускай мове. Калі чыталі параграф па абзацах, то калі даходзіць да таго чалавека, у якога беларускамоўная кніжка, ён працягвае па-беларуску чытаць. І на гэта амаль усе настаўнікі казалі: “Дайце яму рускі падручнік, каб усё было па-руску”. Калі ты малы, табе няма розніцы, але так я паступова беларускую мову забыўся і ёй не карыстаўся. Толькі скончыўшы школу я зноў зацікавіўся беларускай мовай.

Ці была ў вас і вашых бацькоў магчымасць абраць беларускую мову навучання для вас у вашай школе?




Доля людзей, што навучаюцца ва **ўстановах сярэдняй адукацыі** па-беларуску, у працэнтах ад агульнай колькасці на пачатак навучальнага году.



# ВНУ / установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі

Навучэнцы тэхнічных і прыродазнаўчых спецыяльнасцей, правазнаўцы, эканамісты і ўсе студэнты-негуманітарыі вучацца ў Беларусі на рускай мове. Пры гэтым трэба адзначыць, што ў беларускіх ВНУ існуе афіцыйная практыка навучання цалкам на англійскай мове па медыцынскіх спецыяльнасцях. Гэта сведчыць пра тое, што беларускія выкладчыкі здольныя засвоіць нават нязродную мову на дастатковым узроўне для забеспячэння адукацыйнага працэсу

З-за таго, што доля прадметаў, якія выкладаюцца на беларускай мове, няўхільна зніжаецца, у многіх ВНУ зачыняюцца кафедры беларусазнаўства. У якасці прыкладаў гэтай масавай з'явы можна назваць Гродзенскі сельскагаспадарчы ўніверсітэт і Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў (далей – Акадэмія МУС).

Беларуская дзяржаўная мова, нацыянальная мова беларусаў, у адукацыйным працэсе часам апускаецца да ўзроўню замежнай, пра што яскрава сведчыць назва адной з кафедраў Акадэміі МУС – "Кафедра беларускай і замежных моў".

**Кацярына**: У нас на гістфаку усе прадметы, якія выходзілі за рамкі гісторыі, выкладаліся па-руску. Выкладчыкі адмаўляліся выкладаць па-беларуску эканоміку, псіхалогію, паліталогію, антрапалогію і інш. Нашае аддзяленне фармальна павінна было быць беларускамоўным, але фактычна такім не было.

**Дар'я**: Чаму мы, юрысты, якія маюць стаць дзяржаўнымі службоўцамі і абавязаныя ведаць беларускую мову для камунікацыі і абслугоўвання, не можам атрымаць ва ўніверсітэце неабходных ведаў?

На якой мове вам выкладалі большасць прадметаў у ВНУ або ў установе сярэдняй спецыяльнай адукацыі?




На якой мове была большасць вашых падручнікаў у ВНУ або ў установе сярэдняй спецыяльнай адукацыі?



**Таццяна**: Паказальны выпадак адбыўся са знаёмай на пачатку дзевяностых. Яна атрымлівала вышэйшую адукацыю ў Віцебску, вучылася на біёлага. Дыпломную працу зрабіла на беларускай мове. Але ёй не дазволілі абараняць дыплом. Толькі на наступны год яна абараніла дыплом, для чаго давялося перакласці яго на рускую мову

**Дар'я**: Я вывучала права ў Беларускім нацыянальным эканамічным універсітэце. Натуральна, я размаўляла па-беларуску, але адсутнічалі і зараз адсутнічаюць нарматыўна-прававыя акты па-беларуску, адсутнічаюць падручнікі. Выкладчыкі і выкладчыцы не размаўляюць па-беларуску. Калі быў прадмет, які мусіў выкладацца па-беларуску, але выкладчыца не ведала беларускую мову, то ён выкладаўся па-руску.

**Максім**: На іспыце ва ўніверсітэце я ўзяў білет, падрыхтаваўся, сеў і пачаў адказваць на беларускай мове. На другой фразе экзаменатар мяне патрабавальна спыніў: "Нет-нет-нет! По-белорусски вы не будете отвечать!" ("Не-не-не! Па-беларуску вы не будзеце адказваць!")

Ці была ў вас магчымасць абраць беларускую мову навучання ВНУ або ва ўстанове сярэдняй спецыяльнай адукацыі?




Доля людзей, што навучаюцца ва **ўстановах сярэдняй спецыяльнай** (уверсе) і **вышэйшай** (унізе) **адукацыі** па-беларуску, у працэнтах ад агульнай колькасці на пачатак навучальнага году.






# Інфармацыя і беларуская мова

# Навіны

З пачатку 2000-х гадоў у Беларусі пераважная большасць асноўных СМІ выходзіць на рускай мове.

У 2011 г. ўсяго на каналах нацыянальнага тэлебачання перадачы вяліся па-беларуску 626 гадзін (4% эфіру), па-руску – 14 882 гадзін (96% эфіру). На дадзены момант у Беларусі не існуе ніводнага цалкам беларускамоўнага тэлеканала.

У 2015 г. ў Беларусі выходзіла 906 часопісаў і 585 газет гадавым накладам амаль паўмільярда асобнікаў. На беларускай мове выдавалася 135 часопісаў (15% ад агульнай колькасці часопісаў) і 185 газет (32% ад агульнай колькасці газет), іхны гадавы наклад складаў пятую частку агульнага накладу друкаваных СМІ краіны. У 2018 г. колькасць беларускамоўных газет знізілася яшчэ больш, але ў працэнтным выражэнні колькасць выданняў павялічылася амаль на 10% за кошт больш істотнага зніжэння колькасці рускамоўных газет: з 501 газеты было 176 (35,1%) беларускамоўных. Пры гэтым варта адзначыць, што ўсе агульнанацыянальныя газеты, за выключэннем газеты “Звязда”, выдаюцца на рускай мове.

Я магу атрымаць усе навіны, якія могуць мяне зацікавіць, па-беларуску



# Інтэрнэт

**Яўген**: Безліч беларускіх інтэрнэт-крамаў, пляцовак, проста ігнаруюць беларускую мову, не маюць лакалізаваных інтэрфейсаў. Тут можна расказваць бясконца.

**Марыя**: Дыскрымінацыя ёсць на сайтах, калі запаўняеш форму, напрыклад для замовы. Бывае, што ў сайта няма беларускамоўнай версіі, але запоўніць заяўку я магу па-беларуску. Але бывае, што проста немагчыма запоўніць па-беларуску – сайт не прапускае беларускую мову, выдае памылку.

Я магу знайсці ў інтэрнэце ўсю неабходную мне інфармацыю на беларускай мове



# Афіцыйныя апавяшчэнні

Пры перапісе насельніцтва ў 2019 годзе мела месца цікавая з прававога пункту гледжання сітуацыя. Белстат рассылаў рускамоўныя смс-паведамленні пра ўдзел у перапісе. У беларускім заканадаўстве існуе артыкул за стварэнне перашкодаў у карыстанні беларускай моваю. Была распачатая грамадзянская кампанія па прыцягненні Белстату да адказнасці па гэтым артыкуле за парушэнне моўных правоў. Дзясяткі людзей даслалі заявы, але ніякага афіцыйнага адказу яны не атрымалі, да адміністрацыйнай адказнасці нікога не прыцягнулі. Тым не менш, наступныя смс-паведамленні ўжо былі на беларускай мове.

Я атрымліваю важныя апавяшчэнні ад дзяржавы праз смс/радыё/тэлебачанне/газеты на беларускай мове (пра небяспечнае надвор’е і інш.)



# Шыльды і ўказальнікі

**Зінаіда**: Я жыву ў Слуцку. Слуцк – беларускі горад, але шпацыруючы па яго вуліцах, я адчуваю, быццам гэта расійская правінцыя. Назвы вуліц або савецкія, або носяць назвы знакамітых расіян і на шыльдах напісаны па-руску. Гэта знявага нашай гісторыі, нашых знакамітых дзеячаў, нашай мовы. Дайшло да таго, што нават вуліца імя знакамітага слуцкага пісьменніка Абуховіча вынесеная на ўскрай горада і яе назва на шыльдах напісаная па-руску. Гэта пры тым, што Абуховіч – удзельнік антырасійскага паўстання і пісаў байкі толькі на беларускай мове лацінкай, каб надалей быць ад рускай мовы.

Я пачала хадзіць па кватэрах і збіраць подпісы пад зваротам, каб надпісы на шыльдах і ўказальніках дубляваліся па-беларуску. Сабрала больш за 600 подпісаў і даслала петыцыю ў Слуцкі райвыканкам.

З моманту адпраўкі прайшло ўжо 2 гады, а беларускай мовы на шыльдах Слуцка больш не стала. І невядома, ці стане калі-небудзь.

У большасці выпадкаў патрэбная мне інфармацыя на шыльдах і ўказальніках з назвамі вуліц, дарожных знаках, інфармацыйных стэндах даступная на беларускай мове



# Крамы і аптэкі

## Этыкеткі і ўпакоўкі прадукцыі

Беларускія вытворцы пераважна выкарыстоўваюць на этыкетках рускую мову. На беларускай мове часам можна сустрэць толькі назву прадпрыемства, прадстаўленую адным словам. Усе астатнія звесткі, у тым ліку інструкцыя па выкарыстанні, у абсалютнай большасці на рускай мове.

Тэхнічны рэгламент Мытнага саюза “Аб бяспецы ўпакоўкі”, які цяпер дзейнічае і ў Беларусі, стварыў калізію з нормамі, прапісанымі і ў Канстытуцыі, і ў Законе “Аб мовах”, і ў адпаведных беларускіх стандартах.

Тэхнічны рэгламент прадпісвае, што “інфармацыя павінна быць выкладзена на рускай мове і **на дзяржаўнай(ых) мове(ах) дзяржавы-члена МС** пры наяўнасці адпаведных патрабаванняў у заканадаўстве(ах) дзяржавы(ў)-члена(ў) МС”.

Слова “або” ў артыкуле аб маркіроўцы Закона “Аб мовах” зводзіць сітуацыю да наступнага: руская мова зараз у маркіроўцы азначанай прадукцыі абавязковая, а беларуская – не.

Гэта сітуацыя не адпавядае арт. 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, паводле якога дзяржаўнымі мовамі з’яўляюцца беларуская і руская мова.

Крамы і аптэкі. У большасці выпадкаў я магу атрымаць інфармацыю пра тавар па-беларуску.



## Рэклама

Праз непрапрацаванасць моўнага пытання ў законе “Аб рэкламе” у Беларусі пераважае рускамоўная рэклама, якая складае больш за 90% ад ўсёй рэкламнай прадукцыі. Разам з тым да 70% беларусаў станоўча ўспрымаюць рэкламу па-беларуску, а 37% лічаць, што яе ў рэкламе не хапае.

Рэклама і гандлёвыя знакі з’яўляюцца яшчэ адным вялікім складнікам моўнага знешняга афармлення краіны і адлюстраваннем дзяржаўнай моўнай палітыкі ў гэтым кірунку. Рэклама на тэрыторыі Беларусі распаўсюджваецца згодна з Законам “Аб рэкламе”, у якім пункт 2 арт. 10 канстатуе: “Рэклама на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на беларускай і (або) рускай мовах”.

Сёння вага беларускамоўнай рэкламы не дасягае 10% у агульнай масе.

**Аляксандр**: У СССР было больш беларускай мовы, чым з гэтай “незалежнасцю”.  Дыскрымінацыя паўсюль, пачынаючы з крамы. Схадзіце па бульбу ў краму: вы там “бульбу” знойдзеце ці “картофель”? Раз дзве мовы – усё павінна быць на дзвюх мовах. Проста ў нас пра гэта мала хто задумваецца.

# Транспарт

**Сяргей**: Аднойчы, ідучы на чыгунку, вырашыў, што буду гаварыць па-беларуску пры замове квіткоў. Было гэта ў маім родным Мазыры, на чыгуначнай станцыі "Козенкі".

Прыйшоў ды й кажу, што хачу купіць квіткі. Спачатку жанчына спрабавала нават адказваць мне на беларускай, але потым чамусьці вырашыла, што я паляк і пачала адказваць на англійскай. Было вельмі смешна, але разам з тым і крыўдна.

**Алесь**: Звярнуў увагу ў метрапалітэне мінскім. Моўны дысбаланс: асноўныя абвесткі станцый ідуць на беларускай мове, а абвесткі тэхнічнага характару, папярэджванні, – толькі на рускай мове. Тое ж з правіламі карыстання метрапалітэнам на схеме: сама схема даецца па-беларуску, а ўвесь тэкст правілаў – на рускай мове.

Беларускай мове адводзіцца нейкая цырыманіяльная функцыя. А важная інфармацыя даводзіцца толькі на рускай мове, і арганізацыі не лічаць патрэбным выпраўляць сітуацыю.

Грамадскі транспарт. У большасці выпадкаў я магу атрымаць па-беларуску інфармацыю пра расклад руху, а таксама пра прыпынкі, тарыфы (апавяшчэнні, аб'явы кіроўцаў, інфармацыйныя шыльды).



# Кнігі, фільмы, артыкулы

Па інфармацыі Белстата, літаратура на беларускай мове займае 11,4% у агульнай колькасці адзінак выдавецкай прадукцыі і 17,1% у яе сукупным накладзе.

Фільмы і мультфільмы ў перакладзе на беларускую мову складаюць менш за 1% з даступных беларускаму гледачу. Усе пераклады ажжыцяўляюцца па прыватнай ініцыятыве людзей, зацікаўленых у беларускамоўным кантэнце. Дзяржава не падтрымлівае гэтую працу.

Калі людзі шукаюць інфармацыю ў інтэрнэце, то ў большасці выпадкаў гугляць інфармацыю па-руску, бо па-беларуску амаль не існуе артыкулаў на тэмы, якія хвалююць людзей (бацькоўства, кулінарныя рэцэпты, стасункі, здароўе і інш.).

На беларускую мову перакладаецца ўвесь патрэбны мне кантэнт (кнігі, фільмы, артыкулы на цікавыя мне тэмы)



# Меню

**Алесь**: Быў у рэстаране “Лідо”, што на плошчы Якуба Коласа. У кнізе заўваг і прапаноў напісаў пра адсутнасць меню на беларускай мове. Праз пару тыдняў мне прыйшоў адказ, што згодна з пунктам 16 чагосьці там, інфармацыя можа даводзіцца на беларускай або рускай мовах, а наяўнасць меню на беларускай мове – права, а не абавязак прадпрыемства.

Раз беларуская – дзяржаўная мова, значыць, усё павінна быць даступна на гэтай мове: ці гэта меню ў рэстаране, ці інструкцыя, ці яшчэ што.

У кавярнях і рэстарацыях у большасці выпадкаў я магу атрымаць меню па-беларуску



# Прававая інфармацыя

У 2015 г. Канстытуцыйны Суд паведамляў, што ў эталонным банку прававой інфармацыі з прыкладна 200 тысяч прававых актаў толькі 3,1% даступныя на беларускай мове.

У 2021 г. Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі паведаміў новыя лічбы. Так, па стане на 10 верасня 2021 г. у Эталоннай базе даных прававой інфармацыі размешчана 195 130 прававых актаў, з іх 2 729 – на беларускай мове. Такім чынам, толькі 1,4% прававых актаў маюць версію на беларускай мове.

Як бачым, за апошнія гады і без таго невялікая доля прававых актаў, прынятых на беларускай мове, зменшылася ў больш, чым два разы. Пры гэтым абсалютная большасць беларускамоўных актаў маюць тэхнічны, нязначны з юрыдычнага пункту гледжання, характар і невялікія па аб'ёме.

Я магу атрымаць усю патрэбную мне прававую інфармацыю па-беларуску (пра сацыяльныя выплаты, падаткі, правілы дарожнага руху і ўсё іншае, што рэгулюецца заканадаўствам)




**Алесю Бяляцкаму суд Маскоўскага раёна Мінска адмовіў у разглядзе ягонай крымінальнай справы на беларускай мове. Пракурор У. Сайкоўскі заявіў, што правы Бяляцкага як абвінавачанага не будуць парушаныя, калі працэс будзе весціся па-руску, бо сведкі давалі паказанні на рускай мове, да таго ж на рускай мове існуюць законы.**

# Абслугоўванне ва ўстановах і беларуская мова

Мне хапае беларускай мовы ў абслугоўванні, а таксама ў дзяржаўных і прыватных установах



# Лякарні

**Ірына**: Я была адзіная цяжарная ў нашай кансультацыі, у каго была картка на беларускай мове, і праз гэта я сутыкнулася з шматлікімі непрыемнымі сітуацыямі. Жанчына ў рэгістратуры мяне проста ненавідзела, казала: “Боже! Я не учила никогда белорусский язык!” (“Божа! Я ніколі не вучыла беларускую мову!”) Пры афармленні абменнай карткі яна перапісвала дадзеныя з пашпарта і зрабіла чатыры памылкі, пасля чаго доўга выпраўляла напісанае карэктарам, запісвала зверху. Яшчэ такі момант: маё прозвішча па-рознаму гучыць па-руску і па-беларуску. І калі прыходзілі аналізы, увесь час былі нейкія праблемы з прозвішчам. Таксама было шмат сітуацый, калі мяне спрабавалі выхоўваць: напрыклад, чалавек робіць мне ўльтрагукавое даследаванне і запытвае: “А как это по-русски пишется?” (“А як гэта пішацца па-руску?”)

**Уладзімір**: Я працую лекарам агульнай практыкі, усё справаводства вяду па-беларуску. Амбулаторныя карткі, гісторыі развіцця дзяцей і гэтак далей – на беларускай мове. Усё, цалкам. Збольшага ўсе маўчалі, пакуль я аднойчы не выпісаў пасведчанне аб смерці. Гэты дакумент ідзе да ЗАГСа, а пасля ідзе на Мінск.

І вось абурыліся менавіта супрацоўнікі міністэрства статыстыкі. Яны патэлефанавалі і сказалі, каб непасрэдна гэтага доктара “в чувство привели” (“прывялі ў пачуццё”), маўляў, “что он там вытворяет?” (“што ён там вытварае?”) Прасілі, каб перастаў пісаць на беларускай мове. Я не перастаў.

Мяне выклікалі і сказалі, што калі я ў сваёй лабараторыі пішу “нейкія там паперкі” па-беларуску, то гэта можна. Але тое, што ідзе на Мінск, трэба пісаць на рускай мове.

Камунікацыя ў лякарнях і медычных установах у большасці выпадкаў адбываецца па-беларуску



# Кавярні

**Наталля**: Я зайшла ў рэстарацыю фастфуда, хацела замовіць кебаб з ялавічынай. Там мяне папрасілі размаўляць "по-нормальному", дакладна не памятаю, якая была фраза. Я абурылася, сказала: "гэта дзяржаўная мова, і вы мяне дыскрымінуеце". Прадавец мне адказаў, што ён не павінен размаўляць на "мёртвай мове". Я напісала скаргу ў кнігу заўваг і прапаноў.

**Таццяна**: Мы шпацыравалі ўздоўж вадасховішча Дразды і зайшлі выпіць кавы. Я папрасіла кавы і мне прынеслі "Каву" – іспанскае ігрыстае віно.

У кавярнях і рэстарацыях мяне ў большасці выпадкаў абслугоўваюць па-беларуску



# Банкі

ААТ “Белінвестбанк” адзначыў наступнае:

“На жаль, вымушаны канстатаваць, што на дадзены момант не прадстаўляецца магчымым здзяйсняць набор супрацоўнікаў, якія ў дасканаласці валодаюць беларускай мовай. На самай справе, згодна з законам “Аб мовах”, “Беларусь забяспечвае ўсебаковае развіццё і функцыянаванне беларускай і рускай моў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. Грамадзяне маюць права карыстацца нацыянальнай мовай і выбіраць мову зносін”. Паколькі ні ў адным нарматыўна-прававым акце Рэспублікі Беларусь не пазначана, што ў банкаўскай сферы абслугоўванне кліентаў павінна ажыццяўляцца на беларускай мове, то ААТ “Белінвестбанк” выбраў іншую дзяржаўную мову – рускую – мовай зносін з кліентамі”.

**Іван**: Калі выйшла рэкамендацыя ад нацыянальнага банка, што банкам пажадана дамовы складаць па-беларуску, я пісаў звароты ва ўсе банкі, якімі карыстаюся. Паўсюль мне адмовілі. Пісалі, што гэта пастанова мае толькі рэкамендацыйны характар.

**Віталія**: Запоўніла бланк на банкаўскую картку ў “Беларусбанку”. Картка не працавала доўга, некалькі разоў хадзіла, не маглі зразумець у тым ліку і ў банку, чаму картка не працуе. Праз два месяцы высветлілі, што справа ў беларускай мове, давялося мяняць і нанова перапісваць дадзеныя

У банку са мной у большасці выпадкаў камунікуюць па-беларуску



**Таццяна**: Сутыкнулася з тым, што ў банку немагчыма аформіць нейкія дакументы па-беларуску. Проста адсутнічае такая опцыя. Гэта замінае карыстацца беларускай мовай і гэта рэальна крыўдна. Калі мы можам паўплываць на сваё ўнутранае справаводства і весці яго па-беларуску, гэта адно. А калі я прыходжу ў іншую прастору – у банк, і мне трэба рахунак завесці для юрыдычнай асобы, я магу толькі напісаць заяву па-беларуску. Усё, што ідзе далей – запоўніць нейкія бланкі, рэквізіты – тут ужо пачынаецца руская мова. На маё пытанне “Ці можна па-беларуску?” проста кажуць, што такое не прадугледжана: “У нас вся система по-русски, база данных по-русски” (“У нас уся сістэма па-руску, база дадзеных па-руску”).

**Святлана**: Я звярнулася па-беларуску, нешта сказала. Дзяўчына, якая там працавала, мяне не зразумела. Пытаюся: “Што рабіць будзем?” “Что хотите, то и делайте!” (“Што хочаце, тое і рабіце!”) – адказвае. Я кажу: “Ну, не ведаю тады! Калі вы мяне зусім не разумееце, то паклічце якога начальніка”. І яна паклікала. Мусіць, загадчыцу. Я растлумачыла сваю праблему, і тая адказала: “Если не понимаете, то с переводчиком ходите! Ничем помочь не могу, у нас два государственных языка” (“Калі не разумееце, тады хадзіце з перакладачом! Нічым не магу дапамагчы, у нас дзве дзяржаўныя мовы”).

**Зміцер**: На працы зрабілі нам карткі “МТБанка”. Калі заходзіш у інтэрнэт-банкінг – усё па-руску. Нязручна карыстацца. Калі ты беларускамоўны, то навошта табе ўся інфармацыя па-руску? Хочацца, каб было на той мове, якой ты заўжды карыстаешся. Я напісаў ліст у дырэкцыю банка з просьбай, каб яны зрабілі інтэрнэт-банкінг і сайт з інфармацыяй для спажыўцоў па-беларуску. І прыйшоў адказ, што іх усё задавальняе, што ў нас дзве дзяржаўныя мовы і перакладайце самі, калі хочаце.

# Цырульні

**Ігар**: Быў у Кіеве. Зайшоў у цырульню і па-беларуску патлумачыў, што і як мне зрабіць. Майстар усё зразумеў і выдатна зрабіў. Я падумаў тады, што калі заходжу ў беларускія цырульні, то аўтаматычна падбіраю словы падобныя да рускай мовы, проста каб мяне падстрыглі, а не задавалі нейкія дадатковыя пытанні. І ад гэтага стала сумна.

У цырульнях (барбершопах, салонах прыгажосці) мяне ў большасці выпадкаў абслугоўваюць па-беларуску



# Крамы

**Барбара**: Я была ў гандлёвым цэнтры “Замак”, там ёсць крама касметыкі “Missha”. Мы размаўлялі з кансультантам, і потым, калі яна мяне разлічвала на касе, такая: “Откуда вы приехали?” (“Адкуль вы прыехалі?”). Я спытала: “У сэнсе?”. Яна пачала казаць кшталту: “Ну, вы же на украинском языке разговариваете – наверное, из Украины?” (“Ну вы ж на ўкраінскай мове размаўляеце – напэўна, з Украіны?”)

**Яна**: Больш за ўсё нязручна ў сферы побыту, калі ты прыходзіш у краму, а там не ведаюць, што такое “воцат”. Ці ў кавярнях, я кажу: “каву”, а яны такія: “какао?”.

У крамах у большасці выпадкаў прадаўцы і кансультанты камунікуюць са мной па-беларуску



# Праца / навучанне

**Андрэй**: Я працаваў два гады па размеркаванні, а потым прыехаў у свой раён на працу ўладкоўвацца. Мяне накіравалі ў вясковую школу. Зразумела, што я па-беларуску размаўляю, а дырэктар кажа: “Ты гэтую гадасць хоць да нас не прынясі”.

**Юлія**: У класе беларускамоўнае дзіця было адно – нашае. Аднакласнікі не любілі, што дзіця карысталася беларускай мовай на прадметах, якія выкладаліся па-расейску.

**Ганна**: Мяне выклікала начальніца і паставіла ультыматум, што на працы я павінна размаўляць па-руску. Казала, што “ў вольны час размаўляйце на якой хочаце мове, але на працы, калі ласка, па-руску”. Я адмовілася, і мне сказалі, што калі я не падпарадкуюся, будуць наступствы. І ўрэшце, для мяне зрабілі такія ўмовы, што я там не змагла працаваць.

**Алесь**: Падчас мінімальнага ўжывання беларускай мовы ў нефармальнай працоўнай камунікацыі быў выпадак кіраўніцкага ціску: “мы тут все по-русски разговариваем, и ты должен это уважать” (“Мы тут усе размаўляем па-руску, і ты павінен гэта паважаць”).

**Паўліна**: Калі я ўладкоўваюся на працу і кажу: “Добры дзень, ваша вакансія мяне цікавіць”, то адразу сустракаю альбо вельмі актыўную агрэсію, альбо пасіўную. Бывае, што людзі пачынаюць неяк кпіць з мяне.

На маёй працы (навучанні) са мной камунікуюць па-беларуску



# Дзяржаўныя ўстановы

У адпаведнасці з заканадаўствам аб дзяржаўнай службе, дзяржаўныя служачыя павінны валодаць беларускай і рускай мовамі ў памеры, неабходным для выканання іх працоўных абавязкаў. Разам з тым, сыходзячы з сённяшняй практыкі ў Беларусі, работнікі органаў дзяржаўнага кіравання і дзяржаўных арганізацый лічаць, што кожны, хто да іх звяртаецца, абавязаны ведаць абедзьве дзяржаўныя мовы

**Алеся**: Зайшлі ў кабінет, там сядзяць чыноўнікі. І я нешта спытала ў іх па-беларуску, і ў адказ пачула: “А давайте по-русски, на человеческом языке” (“А давайце па-руску, на чалавечай мове”), з такой прыніжальнай інтанацыяй.

**Алесь**: Апошні здзек за маю мову быў, калі я пасля жніўня дваццатага года быў затрыманы. Сядзеў у жодзінскім СІЗА № 8 у 6-й камеры. Папрасіў, каб мне аказалі медычную дапамогу. І прыйшоў прапаршчык і сказаў: “А ты вообще на каком-то особенном счету или учёте? Когда научишься говорить на нормальном языке, тогда к тебе и придёт помощь” (“А ты хіба на нейкім асаблівым уліку? Калі навучышся размаўляць на нармальнай мове, тады і да цябе прыйдзе дапамога”).

**Дзяніс**: Калі ладзілі вяселле і распісваліся з жонкай у ЗАГСе, папярэдне на бланку заявы мы падкрэслілі пункт, што абіраем цырымонію па-беларуску. На бланку ёсць такі пункт выбару мовы. І вось мы такія прыгожыя заходзім у ЗАГС, рэгістратар адкрывае рот і праводзіць усю цырымонію па-руску.

Камунікацыя ў дзяржаўных установах у большасці выпадкаў (выканкамы, міліцыя, падатковая, пошта і г.д.) адбываецца па-беларуску



# Дакументы

Пра здольнасць, але нежаданне, чыноўнікаў весці справаводства па-беларуску кажа наступны прыклад: супрацоўнік дзяржаўнай установы з Паставаў паведаміў, што для таго, каб справаводства ў дзяржаўных установах пачалося весціся не толькі па-руску, але і на беларускай мове, патрэбны загад ад кіраўніцтва вышэй.

**Ірына**: Мы мусілі рабіць чарговую візу, гадоў 4–5 таму. Для візы на дзіця трэба ад маці і бацькі дазвол на выезд. Гэта такая дзіўная паперка, якая запаўняецца ад рукі. Яе ніхто ніколі не пытае, але яе неабходна зрабіць.

Пайшлі мы ў міліцыю, аддзел па міграцыі. Нам далі бланк, ён быў зроблены па-руску, ну, мы яго запоўнілі па-беларуску. І цётачка за акенцам, міліцыянтка, адкінула ад сябе гэты бланк і кажа: “Нет, не положено! Заполняется по-русски! Перепишите всё по-русски, иначе я у вас не приму!” (“Не, няможна! Запаўняецца па-руску! Перапішыце па-руску, інакш я ў вас не прыму”) Таму што, як яна патлумачыла, “пограничники потом будут расшифровывать эту вашу мову” (“памежнікі потым будуць расшыфроўваць гэту вашу мову”).

**Дзяніс**: Калі я пачаў дырэктарам працаваць у Цэнтры культуры і адпачынку, у мяне была прапанова да ўлады: усе дакументы складаць па-беларуску. А таксама шыльды, абвесткі і гэтак далей – каб гэта ўсё было на беларускай мове. Але яны адмовілі ў гэтай прапанове. Спасылаліся на тое, што яны ўсе дакументы адпраўляюць у аблвыканкам, а гэта будзе магчыма зрабіць толькі тады, калі ўсе ўстановы культуры таксама будуць весці справаводства па-беларуску.

Я магу аформіць большасць патрэбных мне дакументаў на беларускай мове (страхоўкі, дамовы, даверанасці і інш.)



**Дар’я**: У кабінеце сядзелі дзве жанчыны, якія паглядзеўшы на мае дакументы, афармленыя па-беларуску, пачалі смяяцца, а потым паглядзелі на мяне і спыталі: “А чаму не на кітайскай?” Я так трохі і прысела, бо не чакала такой рэакцыі. Я кажу: “Ну, таму што дзве дзяржаўныя мовы, і я зрабіла на адной з іх”.

– Вообще-то, у нас русский язык главный (“Наогул, у нас руская мова галоўная”).
– У сэнсе, дзе гэта напісана?
– Ну вообще-то да, два государственных, но руский главный и, короче, так не принимают (“Ну наогул так, дзве дзяржаўныя, але руская галоўная і, карацей, так не прымаюць”).

**Павел**: Неяк спатрэбілася зарэгістраваць прадпрыемства. Вырашыў зрабіць усё па-беларуску. Першая невялікая праблема ўзнікла з узгадненнем назвы – назву ў аддзеле рэгістрацыі ўпарта хацелі перакладаць на рускую. Але пасля дзесяціхвілінных перамоў тое досыць лёгка было вырашана на маю карысць. Без праблем вырабілі і пячатку па-беларуску.

А вось у выканкаме справа не пайшла. Адзін з дакументаў, што туды трэба было падаць, – форма, куды заносіліся асноўныя звесткі. Мае юрысты, вядома, падрыхтавалі тую форму па-беларуску, але высветлілася, што форма ў заканадаўстве існуе толькі па-руску. На гэтай падставе супрацоўніца выканкама адмовілася прымаць увесь пакет дакументаў. У працэсе яна дазваляла сабе рэплікі накшталт: “Вам, як кіраўніку, гэта так важна?”, што было досыць непрыемна.

# Бланкі дзяржустановаў

Пастанова Міністэрства юстыцыі №4 “Аб зацвярджэнні інструкцыі па справаводстве ў дзяржаўных органах і арганізацыях Рэспублікі Беларусь” абавязвае выпрабляць бланкі з рэквізітамі на абедзвюх мовах. Гэта правіла распаўсюджваецца на арганізацыі і ўстановы любой формы ўласнасці. Таксама пастанова вызначае, што мовамі справаводства і дакументацыі з’яўляюцца беларуская і руская мовы, але дэталёвы парадак ужывання дзяржаўных моў не прапісаны.

На практыцы выкарыстанне беларускай мовы з’яўляецца хутчэй выключэннем, чым правілам. Напрыклад, міністэрства па падатках і зборах адмовілася распрацаваць беларускамоўны бланк падатковай дэкларацыі і забараніла выкарыстоўваць яе неафіцыйны беларускамоўны пераклад. А ў Міністэрстве транспарту і камунікацый наогул не зразумелі сэнс пытання аб тым, на якой мове ў міністэрстве вядзецца справаводства, паведаміўшы наступнае: “Суть вашего обращения не ясна. Конституция Республики Беларусь предусматривает 2 государственных языка” (“Сутнасць вашага звароту не зразумелая. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь прадугледжвае дзве дзяржаўныя мовы”).

Бланкі ў дзяржаўных установах у большасці выпадкаў (выканкамы, міліцыя, падатковая, пошта і г.д.) афармленыя на беларускай мове



**Эдуард**: Калі атрымліваў ваенны білет, трэба было распісацца за яго атрыманне, а напярэдадні запоўніць заявы і бланкі. А яны ўсе былі на рускай мове. Я кажу: “Выдайце, калі ласка, заявы і бланкі на беларускай мове, каб я мог запоўніць іх па-беларуску”. А ў ваенкамаце кажуць: “У нас няма такіх бланкаў”.

Тады я ўзяў паперу і проста ад рукі напісаў гэтыя заявы і падаў. Яны ў мяне гэтыя заявы прынялі, і я спадзяваўся атрымаць ваенны білет на беларускай мове, што лагічна.

Прыйшоў атрымаць ваенны білет і атрымаў яго. На рускай мове. Кажу: “Я адмаўляюся падпісваць яго, выдайце, калі ласка, па-беларуску”. На што мне адказалі: “Гэта не ад нас залежыць, у нас няма ўзору на беларускай мове”. І што самае цікавае – у білеце няма ніводнага слова па-беларуску, бо звычайна, калі прыгледзіцца да іншых пасведчанняў – аб нараджэнні, аб смерці і г. д. – там усё дублюецца. А ў выпадку ваеннага білета няма ўвогуле ніводнага слова па-беларуску.

Мне падалося гэта абуральным, бо гэта ж узброеныя сілы Беларусі, а не суседняй дзяржавы.

**Ліза**: Калі я прашу нейкую форму па-беларуску, то ва ўсіх установах мне кажуць, што ў іх ёсць формы толькі на рускай мове. І я сама знаходзіла ў інтэрнэце формы па-беларуску і там было напісана, што яны афіцыйныя. А мне казалі што не, у вас форма па-беларуску і яна не дакладная, яна няправільная і мы будзем толькі па-руску афармляць. Напрыклад, у натарыуса. Прыходзіла афармляць даверанасць, але ў натарыуса нават няма такой опцыі, каб зрабіць гэта па-беларуску

**Андрэй**: Калі я атрымліваў пашпарт, захацеў, каб уся інфармацыя і пазнакі ў ім былі па-беларуску. Але мне не хацелі запісваць па-беларуску прапіску. Хвілін, напэўна, дзесяць мы там змагаліся. Яны казалі, што ў нас дзве дзяржаўныя мовы і я не магу выбіраць, на якой мове мне пазнакі рабіць, бо “мы ўсім пішам па-руску”. Там быў дзіўны аргумент: “Мы не можам запісаць па-беларуску, бо рускія нашы браты”. Гэтую спрэчку скончылі таксама даволі парадаксальна, я сказаў: “У маёй жонкі брат жыве ў Германіі, давайце пісаць па-нямецку”. У выніку яны напісалі па-беларуску.

# Літаратура


Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь: Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 студзеня 1990 г., №3094-XI // Ведамасці Нац. Сходу Рэсп. Беларусь. – 1998. – № 28.

Аб абароне правоў спажыўцоў: Закон Рэспублікі Беларусь, 9 студзеня 2002 г., № 90-З // Звязда. –2002. – 20 сакавіка. – № 55-56.

Инструкция по делопроизводству в государственных органах, иных организациях: постановление Министерства юстиции Республики Беларусь, 19 января 2009 г., № 4 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2009. – № 42. – 8/20434.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь: прынята на трынаццатай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання 15 сакавіка 1994 г. – Мінск: Полымя, 1994.

Кодекс Республики Беларусь о судоустройстве и статусе судей, 29 июня 2006 г., № 139-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2006. – № 107. – 2/1236.

Кодекс Республики Беларусь об образовании: Закон Республики Беларусь, 14 января 2022 г., № 154-З / Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь.

О государственном суверенитете Республики Беларусь: Декларация Верховного Совета Республики Беларусь, 27.07.1990, № 193-XII //Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. – 1991. – №31. – Ст. 536.

О государственной службе в Республике Беларусь: Закон Республики Беларусь, 14 июня 2003 г., № 204-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2003. – № 70. – 2/953.

О некоторых вопросах опубликования и вступления в силу правовых актов Республики Беларусь: декрет президента Республики Беларусь от 24 февраля 2012 г., № 3 // Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь.

О нормативных правовых актах Республики Беларусь: Закон Республики Беларусь, 10 января 2000 г., №361-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2000. – № 7. – 2/136.

Технический регламент Таможенного союза "О безопасности упаковки" (ТР ТС 005/2011): решение Комиссии Таможенного союза, 16 августа 2011 г., № 769 // Еразийская экономическая комиссия.

Технический регламент Таможенного союза "Пищевая продукция в части ее маркировки" (ТР ТС 022/2011): решение Комиссии Таможенного союза, 9 декабря 2011 г., № 881 // Еразийская экономическая комиссия.

Нагорная, А. МОВА 404 / А. Нагорная. – Мінск : Умовы для мовы, 2021.

Нагорная, А., Случак, І. Абаронім мову! / А. Нагорная, І. Случак. – Мінск : Медысонт, 2018.

Образование в Республике Беларусь, 2017. Статистический сборник. Национальный статистический комитет Республики Беларусь.

Образование в Республике Беларусь, 2019. Статистический сборник. Национальный статистический комитет Республики Беларусь.

Пляхимович, И.И. Комментарий к Конституции Республики Беларусь: в 2 т. / И.И. Пляхимович. – Минск : Амалфея, 2015. – Т. 1 .

Праблемы і выклікі дзяржаўнага двухмоўя ў Беларусі і Велікабрытаніі: заканадаўства і практыка / пад агульнай рэд. Я. Крывой. – Мінск : Ostrogorski Centre, 2020.

Самарын, В.І. Да пытання аб забеспячэнні роўнасці дзяржаўных моў у Рэспубліцы Беларусь / В.І. Самарын // Веснік Канстытуцыйнага Суда. – 2007. – № 3.

Случак, І. 10 стагоддзяў дзяржаўнасці і дыскрымінацыі беларускай мовы : беларуская мова ў Беларусі. Рэальныя факты / Ігар Случак. – Смаленск : Інбелкульт, 2022. – 242 с. (Беларуская мова ў Беларусі).

Статистический ежегодник, Национальный статистический комитет Республики Беларусь, 2018.

Статистический ежегодник, Национальный статистический комитет Республики Беларусь, 2019.

Шушкевіч, С. Маё жыццё, крах і ўваскрошанне СССР / С. Шушкевіч. – Мінск, 2013.

Аліна Нагорная

**Даступнасць і дыскрымінацыя беларускай мовы ў Беларусі.**
*Вынікі анкетавання, статыстыка і прыватныя гісторыі.*

Паводле цяперашняй Канстытуцыі, дзяржаўнымі мовамі ў Беларусі з'яўляюцца беларуская і руская. Але, нягледзячы на іх фармальна аднолькавы статус, руская мова дамінуе ва ўсіх сферах, а людзі, якія карыстаюцца беларускай мовай, штодзённа сутыкаюцца з дыскрымінацыяй. Па-беларуску немагчыма атрымаць адукацыю, аформіць картку ў банку, запісацца да лекара, скласці дамову, набыць прадукты, прачытаць важную тэхнічную інфармацыю.

Мы апыталі 482 чалавека ва ўзросце ад 15 да 72 год, якія карыстаюцца беларускай мовай у Беларусі. У фокусе апытання была даступнасць адукацыі, інфармацыі і абслугоўвання на беларускай мове.

Рэдактар: Алесь Чайчыц
Дызайн і вёрстка: Зьміцер Чыгрын ©
Аліна Нагорная ©

2023